

ГРОШЫ ПАД ЖЫЛЛЁ СТАЛІ ЯШЧЭ ТАННЕЙШЫЯ 3

ЗНОЎ ЗАПАХНЕ ЗІМОЙ 16




Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

+TV ПРАГРАМА

16 ЛЮТАГА 2024 г. ПЯТНІЦА № 33 (30167)


## ЦЫТАТА ДНЯ



**Ігар ПЕТРЫШЭНКА, намеснік прэм'ер-міністра:**

*«Падрыхтоўка па рабочых прафесіях, навучанне сярэдне-тэхнічнага персаналу і спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй — гэта звёны аднаго ланцуга. Каб атрымаць кампетэнтных супрацоўнікаў для работы з высокатэхналагічным абсталяваннем, трэба і навучаць іх на такім. Яны павінны быць якасна падрыхтаваны. А якасна падрыхтаваць можна толькі ў добра абсталяваных з матэрыяльнага пункту гледжання каледжах і з адпаведнай выхаваўчай работай».*

## КОРАТКА

- **БелАЭС сумарна выпрацавала больш за 25 млрд кВт·г электраэнергіі.**
- У РНПЦ дзіцячай анкалогіі з'явіўся новы дыягнастычны комплекс.
- **Рашэнне аб узаемным прызнанні ў краінах ЕАЭС дакументаў аб адукацыі педагогаў і юрыстаў набыло моц.**
- «Навуковыя выхадныя» прапануе правесці дзецям і бацькам Нацыянальны дзіцячы тэхнапарк.
- **Зборная Беларусі засталася на 95-м месцы ў рэйтынгу ФІФА.**
- У Беларускім дзяржаўным медуніверсітэце вучацца студэнты з 60 краін.
- **У Беларусі ўвялі 1,2 млн кв. м новых электрадамоў у 2021 — 2023 гадах.**


ISSN 1990 — 763X


Дата

# Аб'яднаныя агульнай памяццю





**З нагоды 35-й гадавіны вываду савецкіх войскаў з Афганістана каля мемарыяла «Востраў Мужнасці і Смутку» адбыўся мітынг-рэквіем**

Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

**Кожны год да гэтага сімвалічнага месца, якое ў народзе называюць Востравам слёз, накіроўваюцца людзі. Вялізныя людскія плыні сцякаюцца да сталічнага помніка, які сціпла ўвасобіў і мужнасць беларусаў, якія годна выканалі інтэрнацыянальны абавязак у Афганістане, і смутак усіх тых, хто не дачакаўся дамоў сваіх сыноў, мужоў, бацькаў, братоў, вярнуўся на Радзіму без баявых таварышаў...**

Гэтая дата, якая адзначаецца і як Дзень памяці воінаў-інтэрнацыяналістаў, мае сакральны сэнс для многіх нашых грамадзян. На працягу дзесяці гадоў (з 1979 да 1989 гг.) доўжыўся ўзброены канфлікт паміж афганскімі ўрадавымі і саюзнымі савецкімі войскамі, якія імкнуліся захаваць у Афганістане пракамуністычны рэжым, з аднаго боку, і мусульманскім афганскім супраціўленнем — з іншага. 15 лютага 1989 года з Афганістана былі поўнасцю выведзены савецкія войскі. Па апошніх афіцыйных даных, безвар'отныя страты ў афганскай вайне склалі 15 051 чалавек. У палоне апынуліся 417 вайскоўцаў. Параненымі, траўміраванымі і кантужанымі дадому вярнуліся 53 753 чалавекі.




СТАР. 4


Гарадское асяроддзе

# З ПЕШАХОДНЫМ МОСТАМ І ЗОНАЙ АДПАЧЫНКУ

## У Гродне вызначаюць будучыню набярэжнай у гістарычнай частцы горада



**Да вырашэння гэтай задачы падступаюцца не ўпершыню. Яшчэ гадоў дзесяць таму быў рэалізаваны першы праект па замене аварыйных калектараў і інжынерных сетак. Затым адбылося добраўпарадкаванне тэрыторыі, вызначана пешаходная зона, пастаўлена агароджа, адрамантавана лесвіца, устаноўлены архітэктурныя збудаванні. Але час патрабуе новых падыходаў. Гродна развіваецца як турыстычны горад, і набярэжная можа стаць яшчэ адной унікальнай лакацыяй горада над Нёманам.**


СТАР. 3